Анатоль Клышка

БУКВАР

Падручнік для 1 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

Зацверджана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

7-е выданне, перагледжанае

Мінск
«Народная асвета» 2010

УДК 811.161.3’35(075.2=161.3)
ББК 81.2Беи-922
К47

Мастакі:

В. А. Войтка, М. А. Жахавец, А. Э. Жакевіч, А. Г. Званароў, Н. Л. Клімава, В. Г. Крупенькава, Л. А. Мурашка, А. П. Пратасеня, А. Х. Угранінава.
Вокладка В. В. Катовіча

Рэцэнзент:

доктар пед. навук, прафесар кафедры методык дашкольнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» *Н. С. Старжынская*

 — чытае настаўнік

УДК 811.161.3’35(075.2=161.3)
ББК 81.2Беи-922

ISBN 978-985-03-1455-0



Ад нараджэння
звяры знаюць
ямы свае;
птушкі ведаюць гнёзды свае;
рыбы ў моры і ў рэках
чуюць віры свае;
пчолы бароняць
вуллі свае, —
гэтак жа і людзі,
дзе нарадзіліся
і ўскормленыя...
да таго месца
вялікую ласку маюць.

Францішак Скарына





























































 

























		Сс	Пп
		Мм	Тт
		Лл	Нн
		Шш	Рр
		Кк	Дд





Сс






Сс





Калі сталяр робіць мэблю,
сотні **С** ляцяць з-пад гэбля.







Пп







Пп





П стаіць, як перакладзіна:
на дзве палкі трэцяя пакладзена.











Мм





Мм





М нібы сталярскі метр,
як расцягнеш — з кіламетр.



с п м т л н ш р к д

Т т







Т т

Т стаіць, як табурэт,
носіць з гонарам берэт.













М	Т	С
С	П	М
Т	С	П
С	Т	М









Лл













Лыжы з палкамі пасталі,
каб у іх вы **Л** пазналі.















Нн





Нн






Літару **Н** каб у школу прывесці,
трэба, напэўна, насілкі прынесці.









Шш





Шш



Шырокая шафа. А хто здагадаецца:
літара **Ш** у гэтай шафе хаваецца.





























Л Н Ш

Н Ш Л

Л Н Ш

Ш Л Н












Рр







Літара **Р** адчыняе нам дзверы,
не ўвойдзеш без гэтае ручкі ў кватэру.











Кк







Да крука прыладзім крук —
і значок свой мае гук.

Кк









с п м т л н ш р к д

Дд






Дд



Д залезла ў домік:
— Адшукай мяне, гномік!









с п м т л н ш р к д







д	р	к
к	д	р
к	р	д
д	к	р






Д М
Д Н
М К
М КЛ
М СТ
К Р
К С
К Н
Л К
Л Н
Л Ш
П К
П С
П Т































с	л

с	р

с	т

с	л

т	н

т	р

р	т

р	к


ш	р

ш	ш



























? ?








? ? ?





? ? ?



















А а

А а

	а			
м	ма	м	ра	да
л	ла	ма	р	ка
с	са	л	ка	ла
н	на	ла	к	ма
ш	ша	с	да	на
р	ра	са	д	па
п	па	ша		ра
т	та	та		са
к	ка			та
д	да			ша












	д	к	л	м	н	п	р	с	т	ш
а	да	ка	ла	ма	на	па	ра	са	та	ша



Саша
Даша
Паша
Маша

Ала
Ада
Лада

Саша	Даша	Паша	Маша
Са ша	Да ша	Па ша	Ма ша
Саша	Даша	Паша	Маша

Саша	Даша	Паша	Маша
Саш	Даш	Паш	Маш
Са	Да	Па	Ма
С	Д	П	М

С	Д	П	М
Са	Да	Па	Ма
Саш	Даш	Паш	Маш
Саша	Даша	Паша	Маша




Я я Я я




я
як

Ян
Яна
Яша

на
наша
наш




— Я Ян.
— А я Я́на.
— А я Рая.

У у

У у







— У-ра!





у | к | к .





у | | .





у | к | к .

У Яна 🍎🍎.

У Дана 🍐🍐.

Дан да Яна:

— На, Ян, 🍐.

А Ян:

— Дан, на 🍎.

У Яна 🍎, 🍐.

У Дана 🍐, 🍎.




І і

Іі




















і

,






і

,







і

,






і

.





Мама.



Тата.



Я.



Мая і Рая.



Мая, Рая і я.



Мама і я.



Тата і Рая.



Тата, мама, Рая, Мая і я.



Наш Пан.

Іна Рая рада
Іра Мая рад

— Мама, у нас Іра і Іна.
Я Іра, і яна Іра.
Як я рада!
Мама: «І я рада, Іра».
Іна: «А я Іна».
Мама: «Я рада, Іна».
Іна: «І я рада».
Мама: «На, Іна .
Іра, на ».









Хх

Хх



Ух!



Ах, ах!



х а́ т а

ах
ха

хап
тата
хата



Наша хата.
Мама да Яна:
— На, Ян, шар.
А Ян да ката:
— , на шар.
хап шар. А шар — !

Ах, , ах, шар!





Бб
















рана
ранак

абаранак

Дан і Бас



У Дана банан і абаранак.
Дан:
— Бас, на абаранак.
Рад Бас. У Баса абаранак.
І Дан рад. У Дана банан.








там	бас	дах	рак
сам	нас	мах	бак
нам	пас	бах	мак
дам		пах	так

наш
нам
нас

бас
бак
бах

там
так

мах
мак



Раман
Тарас

Марат
Патап
Макар

Марат [ ]
Макар [ ] ?

сабака

аб
бак
бас
каб

аса
каса
асака



у
ру
ду
ку
лу
му
ну
пу
су
ту
шу
бу

іду	рука	дуда
і ду	ру ка	ду да
іду	рука	дуда

іду	рука	дуда
ід	рук	дуд
і	ру	ду
	Р	д
і		
ід	р	д
іду	ру	ду
	рук	дуд
	рука	дуда

рука	хада	дуда
у руку	на хаду	дудар



Я дудар

Мама дала дуду.

Я дуду — у руку, іду і на хаду:

— Ду-ду, ду-ду!

	к	л	м	п	р	с	т	ш	х	б
а	ка	ла	ма	па	ра	са	та	ша	ха	ба
у	ку	лу	му	пу	ру	су	ту	шу	ху	бу

Шаша










Іду на шашу.
Тут .

Тут шум.
Тут рух.



	рух
	пух
сук	бух
лук	дух


	а		а		а
л.к		п.х		д.х	
	у		у		у

му	му	аса	раса
му-му	каму	каса	у расу
ку-ку	таму	раса	сук
			на суку



у	Там рака. Там асака́.
с**у**	Кашу рана, у расу.
ш**у**	Каса: шух-шах, шух-шах!
к**у**	А на суку: ку-ку, ку-ку!
м**у**	А : му-му, малака каму?

	а	ра..	
р.ка			ка
	у	..ра	



Зз




Зз




за	за	рана	туп
Аза	каза	ранак	тупу
	лаза	зранку	


Каза Аза

У нас каза Аза. Зранку я за казу і на пашу. А тут лаза.

— Каза, на лазу.

Каза тупу-туп. І тут як тут.

Мама рада, як я пасу казу.





Оо


Оо



о
до
то
ло

мо
но
бо
по

зо
со
шо
хо



	д	к	л	м	н	п	р	с	ш	б
а	да	ка	ла	ма	на	па	ра	са	ша	ба
у	ду	ку	лу	му	ну	пу	ру	су	шу	бу
о	до	ко	ло	мо	но	по	ро	со	шо	бо

Тома	Рома	Зоя
То ма	Ро ма	Зо я
Тома	Рома	Зоя

Тома	Рома	Зоя
Том	Ром	Зо
То	Ро	З
Т	Р	
		З
Т	Р	Зо
То	Ро	Зоя
Том	Ром	
Тома	Рома	



Тома
Рома
дома

Лора
Дора

3 2 1	3 4 1 2
с о н	л а з а́

Наш Бас

— На, Бас, .
— Што — я каза?
— На, Бас, бурак.
— Што — я трус?

— Бас, на .
— О, мая ядá!
Сма-ка-тá!



о
зо
ро
до
то
ло

Хто дома

— Зоя, а Лора дома?
— Дома.
— А Рома?
— І Рома дома.
— А Тома?
— І Тома дома.
Дома Зоя, Рома,
Тома, Лора і Паша.




 Успомні казкі.
Што пераблытаў мастак?





Лора дома.
Рома дома.
Тома дома.
Дома шуму-шуму.

сом	Тома
дом	том
дома	лом



сом	бор	ком	
сок	бок	кот	том
сон	бот	кол	ток

Вв





Вв







вам	лава	
вас	слава	нам
ваш	Слава	воінам



Слава воінам!

У Яна .

Вара: — На, мама, вазу і ваду.

Ян: — Мама, на .

Вова: — На, мама, .

Бас то тут, то там

Зоя дала Басу .

— Бас, на і — марш да Яна.

Бас за і да Яна.
А Ян:

— На, Бас, і — да Зоі.


Бас за і да Зоі.

Так Бас то ад Зоі да Яна. То ад Яна да Зоі.

Бас то тут, то там. То там, то тут.



Гг







рак	парк	так	свая́
грак	парка́н	такса́ма	сваяк







Хто тут?

— Ко-ко-ко!
— Га-га-га!
— Іга-га-га!
— Ку-ку, ку-ку!
— Кар, кар!
— Ква, ква!




Галка, голуб, грак, груган
раптам — шух на наш паркан.
Як мага — да іх гусак:
— Я таксама ваш сваяк!


ход	брат
год	Ігнат




У Маі брат Ігнат.

Ігнату 1 год. Так мала!

А Маі — 5. Хутка — у школу!

А што тут у Маі? Рукзак. У ім буквар.







а	о
дам	дом
бак	бок
мак	мок
сам	сом

так	сам
тук	сум
ток	сом

гол год кара
год карагод карагод



то ад нас да іх, то ад іх да нас.
— Гоша, пас!
У-дар!
— Ура, гол!

Карагод



Саша дала руку Зоі,
Зоя — Ігару,
Ігар — Маі,
Мая — Раі,
Рая — Таі.
Тут у нас і карагод!






Чч







рот	нара́	дом
чарот	На́рач	дадому

Нарач

Нарач. Вада і вада.
Шапоча чарот. Там бачу чараду качак.
Хутка ноч. Час дадому.



хто	тата	варона	мох
што	хата	сарока	у моху

У каго якая хата



Тут наша хата.
У нас хата.

У Чака буда.
Буда — яго хата.

А тут мох.
У моху .
Тут іх хата.

Там варона і
сарока.
У іх .

А там нара.
Там .

А тут што?

Хто тут?



Ы

ы



сад	куды	лозы	вада
сады	туды	козы	да вады
чыж	тады	косы	ад вады
чыжы			

ы
мы
вы
ты

ды
зы
сы
ры

— , , вы куды?
— Да вады, да вады.

— А вы, куры, вы куды?
— Ад вады, ад вады.

— А вы, козы?
— Мы — у лозы, у лозы.



на

наш	наша	шаша	шыны
наша	Маша	на шашы	машыны




— Мама! Мама! Наша Маша на шашы. На шашы машыны. Ах, ах, ах!



с	ы	р
с	ы	н
с	ы	п
м	ы	ш
ч	ы	ж
р	ы	с



мыш
чыж
рык
рыс



сыр
сып
сын

ма..
та..
То..
ха..

Ро..
Ры..
На..

ма

та

Наш Саша

Наш Саша малы.

У Сашы са́мы сон. А тут то муха, то аса.

— Ну-ну, муха! Ну-ну, аса!



рака	каза	дача
рука	казала	удача

Вада і вуда



Тут хата, а там рака. Я за вуду і на раку.

Іду. А тут — бух у ваду:

— Тану! Тану!

Во і рака. «Удачы!» — казала мама.

А якая тут удача? Кату на яду́!



Рыбы

плотка
вугор

сом
шчупак
сазан



пух кол хор
Пушок вакол хораша

У шалашы



Наш шалаш. Тут Раман і Тарас.

Тут і Пушок.

Рана. Раса. Вакол сыра.

А тут суха. У шалашы хораша.



Кашы

У нас кашы́. Тры кашы. І на ягады, і на грыбы.































мыш
мак
сыр
сук

бок
бор
кош









бот
бак
рот
рак

рыс
лак
лук
лом



Жж



Жж

	лава	жаба
зала	слава	жабка
казала	слова	жарт
паказала	словы	жартам

Словы

— Хто скажа слова на «ж»? — спытала Зоя.

Рая тут жа кажа: «Жабка».

А Мая кажа: «Жыта».

Зоя жартам да Жоры:

— І ты, Жора, скажы слова на «ж». — І паказала жука.

Жора і кажа:

— Сук!

— Ах, Жора! Хто ж так кажа? То ж жук, а ты кажаш сук.



сумна	раптам	учора	двор
сумн	рапта	учор	дво
сум	рапт	учо	дв
су	рап	уч	д
с	ра	у	
су	р	уч	д
сум	ра	учо	дв
сумн	рап	учор	дво
сумна	рапт	учора	двор
	рапта		
	раптам		



Рома і Жора дома.
За акном сыра.
 кап-кап!
Сумна Рому і Жору дома.
Учора было суха. Учора была пагода.
І раптам во — !
— Ура! На двор!

пара́	вы	выгода	сама
парасон	выгода	пагода	самакат



Парасон — адна выгода:
кожны раз пад ім пагода!



Рома рад

Самакат, самакат!
Самакату надта рад!
З кута — у кут,
і тут як тут!

Ян і баян



Ларыса
Марына
Тамара
Данута
Наташа

Хто тут скача пад баян?

мы	жар	кош
мыла	жарт	кошка

— Вушы мыла?
— Мыла.
— Нос мыла?
— Мыла.
— А мыла?
— Ох, забыла.



Жарт

Мыла кошка нос.
Тома і кажа:
— На, кошка, мыла.





кола	дом	сто	гара
школа	з дому	стары	гарачы

— А ты куды з дому? — кажа мама Янку маломy.

— У школу хачу.



ы
т**ы**
д**ы**
с**ы**
л**ы**
р**ы**
в**ы**
ж**ы**
ч**ы**

новы — стары
малы — …
дужы — …



сыры — …
гарачы — …
малады — …




[ ] [ ], а [ ] [ ].

Фф













вага	форс	фота	кус
увага	фарсун	фортка	фокус

Кот Фарсун

Канапа. І тут бачу футра — наш Фарсун.

Я за [фотаапарат]. І кажу кату:

— Фарсун, увага. Фота! Раз, два, тры!

А кот — скок на фортку!

І во фота. Ну і фокус! На ім ад ката адно яго хвост.

Ну і фота!





У ката і мышку

— Тарас, ты кот. А ты, Марына, мышка.

Тут Тарас, там Марына.

Тут кот, там мышка.

— Мышка, мышка, тут кот!





рашы	рыс
рашыла	рыса
рашала	Ларыса



Сама рашыла

Мама мыла раму. А Ларыса рашала.

— Мама, мама, рашы:

2 + 1 + 1.

Мама кажа:

— Лора, сама рашы.

Ларыса рашала, рашала — рашыла.

— Мама, я рашыла. Сама рашыла!

мыла	мыш	рабы́	зоры	так
міла	мышка	рабі	зорка	мастак
вазы́	мішка	зрабі	зоркі	мастакі
вазі	міска			



і
лі
мі
ні
зі
сі
бі
пі
гі
кі
фі
ві



Што за мастак?

Зіма.
Ранак. Мароз.
Мікола зірк на акно. А там узоры. Ды якія! Зоркі, макі, лісты.
— Ну і мастак мароз! — кажа Мікола.

Загадка



Хто над намі дагары нагамі?

ы вы бы гы зы лы мы ны пы сы фы
і ві бі гі зі лі мі ні пі сі фі

кот, кут, кіт	мышка, мішка, мушка, мошка


О
Б О
Л
У
З
С У
Б П
Ч А
Р Ы
Н О
Г А
З
С
Б О
С А
Д
Т


У
Р
П
У
Л
У
Г
Х
Н
О
Ч
Ы
Ж
М
Ы
Ш

рос	зуб	ліс	жар	вілá
рост	зубр	ліст	жарт	лаві
бор	кус	кар	парк	лавіла
борт	куст	карп	мост	злавіла

Жмуркі

— Зараз лаві ты, Жанна, — кажа Міла.

Жанна насунула хустку на вочы.

Лавіла, лавіла. А потым — зірк уніз. А там кажух!


«Дык то Жора», — падумала Жанна. І хоп рукамі! Злавіла!


Ажно пусты кажух.



Лілí, лілí —
і налілí.
Ну і налілí!







а	о	у	ы
вар	бор	луг	рык
твар	збор	плуг	крык
вас	вон	тук	
квас	звон	стук	
мак	рот		
смак	крот		
рак	хор		
грак	тхор		



«Рагатыя» словы

РОГ
пі**РОГ**
па**РОГ**

РОГат
да**РОГ**а
наса**РОГ**

Ээ



Ээ

Ала	арэ	рэчка	рвалі
Эла	арэх	грэчка	нарвалі
Эма	арэхі	рэпка	

э
бэ
вэ
гэ
дэ
жэ
зэ
мэ
рэ
тэ
чэ
шэ

У арэхі

Жэнін і Нэлін тата арэ на полі.

А мы — Эла, Эма і я — у арэхі.

Нарвалі кош. У кішэні насыпалі.

А Рэкс і шэры Тузік капалі нару. Шукалі лісу.



Успомні казку пра рэпку



Мы і рэха



Рана.

У грыбы ішлі Ніна, Рома, Віка і Ліна.

Тут бор. Тут і рэха.

Рома рэжа баравікі і кліча:

— Ніна!

А рэха яму гэтак:

— Іна!

Рома:

— Тут каліна!

А рэха:

— Тут Ліна!

Эх, рэха, рэха!

Што за грыбы?



лісіч



баравікі



рыжы



Языкаломка

Да горада дарога — угору,
а з горада — з гары.

раз	Рома	кус	схвовы
разам	Ромава	куст	хованка
		за кустом	хованкі


У хованкі

— Віка, ты куды?

— Я — за куст.

— А я за ліпу, — кажа Шура.

— А я, як кот, на ліпу, — кажа Рома.




— Раз, два, тры. Я іду. Шура, бачу, ты за дрэвам. А ты, Віка, за кустом. Разам са сваім Басам. Бачу яго хвост.

А во тут — Ромава панама!

— На, Бас, панаму. Да Ромы!

Бас за панаму і — скок да ліпы.

Ну і Бас!



Й

й

мы	ой	май	той
мый	ай	гай	твой
вы	эй	чай	свой
вый	гэй	рой	мой

д з г м ч — ай

т б р м — ой

мы ма мо — й



ка

чай..   зай..   май..   шый..

Чый гэта нос?

















«Вароніны» словы

КАР

КАРта   то**КАР**

КАРавай   Ма**КАР**

вілі́	пуск		хутка
лаві́лі	пускалі	пырскі	хутчэй
злавілі	упускалі	пырскай	Андрэй

Рой



Зіна і Раман убачылі рой.

— Тата, тата, там рой.

— Андрэй, хутчэй, — кажа тата. — На . Пырскай вадой на рой.

А сам у хату. За рэшата — і на ліпу.

Злавілі рой. А потым упускалі рой у .



й — і
гай — гаі
край — краі
каравай — караваі

3 2 1 4 5
л і п к а
3 5 1 4 2

Мі



Ь

ь

гусі — гусь
язі — язь
карасі — карась
ліні — лінь

рыс — рысь
стол — столь
мароз — марозь

Васіль	Міхась	конь	матыль
васількі	Міхаська	канькі	матылькі

— Мароз, мароз,
ты раку нам
замарозь!



Мы — сані,
з горкі імчым самі!

У Санькі новыя санкі.

Хто лішні?

Язь, лінь, матыль, акунь.

лань — лані		ішлі
конь — коні	рост	дайшлі
рысь — рысі	расткі	зайшлі
лось — ласі	пáрасткі	выйшлі

Ласі

Выйшлі з балота ласі. Лось і ласіха.

Колькі клопату ім зімой! Кінь вокам — пуста на полі. Ні травы, ні лістка.

А вось і казулі. Тут ім корм. Тут і соль.



Ее

Ее



чые	твае	дае	курлы́	куга́
мае	свае	падае́	курлыкае	кугакае

Хто які голас падае́

Пытае Ясь у малой Евы:

— Скажы, хто там у нашым двары рыкае, мэкае, бэкае?

— Карова, каза, баран.

— А знаеш, хто каркае, буркýе?

— Варона, голуб.

— Добра.

— А зараз адкажы: хто з птушак куке, курлы́кае, куга́кае?





сена	дача	рык	пень
на сене	здача	крык	ліпень
насенне	задача	крок	ясень
		крук	восень



Важкі кош

Вера і Валера пад дубамі збіралі жалуды.

— Ну і важкі наш кош, — сказала Вера Валеру. — Шмат назбіралі.

— І добра, — кажа Валера. — Кожны жолуд — гэта ж дуб. Ведаеш, у нашым кошыку — дуброва.

ві	ве
гі	ге
бі	бе
пі	пе
зі	зе
сі	се
ці	це
кі	ке
лі	ле
мі	ме
ні	не



Шануй лес. Лес — наш скарб!

ліс	Ліна	сіла	сена
лес	Лена	села	сіні

восень	тры	бра́ла	ставіла
восеньскі	ветрык	сабра́ла	паставіла

Восеньскі букет



Восень. На лузе ні кветкі.

— Увосень так сумна, — кажа Гена.

А Лена яму:

— Што ты! Між елак пала́е рабіна. Як хараша!

А тут і ветрык як сыпане лістамі! Ружовымі, бурымі, залатымі.



Сабрала іх Лена. У збанку паставіла на акне. Хіба не букет?



Ветрык вее,
насенне сее.
Што за насенне
ветрык вее?

дрэва		**лес**
дуб	—	дуброва
елка	—	ельнік
хвоя	—	хвойнік
асіна	—	асіннік






Цц

Цц

мох Цімох	боязь баязлівы баязлівец	навáла навальніца	мала маланка

Цімох-баязлівец

Аднаго разу была навальніца. Паліла маланка. Са страху залез Цімох пад ложак.

Там цесна, душна. Але церпіць Цімох. Баіцца, трасецца.

А навальніца тым часам ужо мінула.

Якія ягады?


брус


су

ніцы


клуб


чар

соль	сальнíца
цукар	цýкарніца
цукерка	цукéрніца

Вера	сустрэча	кніга	гарыць
Вераніка	насустрач	кніжка	гаворыць



Загадка

Ішла Вераніка з магазіна.

Насустрач — Алесік.

— Што ты купіла?

— Угадай. Без языка, а гаворыць.

— Кніжка.






Каза і .

— Тук-тук.
— Хто там?
— Ваша мама.
— Наша мама — каза.

А ты .

Што можа зрабіць адна літара



Вучоба:

піша, чытае, лічыць, рашае, … .

Гульні:

ловіць, кідае, хаваецца, шукае, скача, … .

Прачытай словы	Прачытай сказ
7кі, с3ж, 7афор	На 2рэ ве3к.

чытала	левы	правы
прачытала	злева	справа
перачытала	налева	направа

Што чытала Паша?

Лена пісала злева направа: ПІЛІП.

А Паша чытала справа налева: ПІЛІП.

І так ПІЛІП. І так ПІЛІП.

Лена пісала: ПАТАП.

І так ПАТАП. І так ПАТАП.

Потым Лена напісала: боб, сон, рыс, кот, луг.

А што прачытала Паша справа налева?



Размова

— Давай паскачам праз скакалку.

— Але ж нас двое.

— А Шарык нашто? Нас трое!

даі	паі	паіла	малако	ісці
даіла	паіла	паела	малачко	есці

Кот Варкот



Мама даіла карову.

І наш Варкот тут як тут.

Чаго кот чакае?

Ды малачка!

Падаіла мама Зорку. Дае кату малака і кажа:

— Смачна есці!

Ў ў

вы	быў	даў	кіну	ішоў
выў	рыў	жаў	кінуў	выйшаў
мы	чуў	жыў	вучы	водны
мыў	гуў	шыў	вучыў	ніводны

Школа на лузе

Выйшаў Міхаська за поле. На рэчку.

Над лугам плыў гул. Нібы кожны тут вучыў свае гукі.

— Ж-ж-ж, — гуў чмель.

— З-з-з, — звінела пчала.

— Н-н-н, — ныў у кустах камар.

— Р-р-р, — падáў свой голас і Тузік.

Толькі рыбка маўчала ў рацэ. Напэўна, ніводнага гука не ведае.



«Жабчыны» словы



бу**КВА**р
КВАтэра
КВАч
КВАс
с**КВА**рка
мор**КВА**

Скача жабка —
скок ды скок!
Вучыць
першы свой
урок.



Загадкі

Летам шэранькі,
зімой беленькі.

Іголкі мае,
а шыць не ўмее.





й	дай	мый	шый	вый	рой	сей
ў	даў	мыў	шыў	выў	роў	сеў

ішлі
прыйшлі

рып
скрып
скрыпка
скрыпачка

дуда
дудачка
рыў
жа́рыў

Музы́кі

Вось прыйшлі музыкі
чарадой вялікай.
Граў на скрыпачцы камар,
на дудачцы — чмель-дудар.

Муха на цымбалах
струны калыхала.
А чырвоны конік
жарыў у гармонік.

Якуб Колас



Загадка. Вісіць сіта, не рукамі звіта. 

зуб	клубы	скарбы	табурэт
зубр	клуб	скарб	табурэтка
зубры́	крабы	карпы	верабей
зебры	краб	карп	верабейкі

Снегіры

Заснулі белыя палеткі.
Мароз загрукаў
на двары.
Зірнеш з акна:
нібыта кветкі,
на сініх вербах
снегіры.

Анатоль Вялюгін



майстар	корм
майструем	кармушка

Мы майструем

Мы ў школьнай майстэрні. Тут малаток, піла, гэблік. Мы майструем, рэжам, пілуем. Вось збілі дошкі. Выйшла кармушка. Павесілі кармушку на рабіне. Пасыпалі круп, розных крошак.

А тут і верабейкі.



горка	рабілі	друг
Рыгорка	зрабілі	дружна
вугаль	морква	дружба
вугалькі	морквіна	дружбакі

Дружбакі

Рыгорка хворы. Сумна Рыгорку: ні з канькамі на каток, ні з лыжамі на горку.

Прыйшлі Зіна і Гена. Зрабілі пад акном бабу са снегу. Вочы — вугалькі. Нос — морквіна. У руках — венік.

Зірк хворы Рыгорка ў акно. Весела стала ад Генавай і Зінінай увагі.



Рабі другому тое, што хочаш, каб рабілі табе.

Словы-браты:

спачуваць, спагадаць, шкадаваць.

Лявон	мяце	ішоў
Лявоніха	мяцеліца	пайшоў

А гармонік грае, грае...

Хто скача «Лявоніху»?





Яня Соня
Аня Сеня
Маня Феня
Ваня Веня

Фаня Жэня
Таня Рэня
Тоня



я
ня
ля

ся
зя
ця

мя
пя
бя
вя



Хто кружыцца ў «Крыжачку»?





Віця	Каця
Міця	Косця
Пеця	Насця





Хто круціць «Мяцеліцу»?





Оля	Ляля
Толя	Аля
Коля	Валя
Поля	Галя
Ліля	Нэля



а	ба	ва	за	ла	ма	на	па	са	ца
я	бя	вя	зя	ля	мя	ня	пя	ся	ця

Я́на	насі	вазі	бары	сачы	звары
Яня	нясі	вязі	бяры	сячы	звяры

парася	гусяня	тры	пара
кураня	ягня	хітры	парта
качаня	цяля	слівы	упарта
кацяня	жарабя	баязлівы	упарты

У каго хто?

У курыцы кураняты. У гусі гусяняты. У качкі качаняты. У кабылы жарабя.

А там на двары відаць яшчэ ягня, цяля, парася.

Чые яны?



і	лі	мі	ні	ві	бі	пі	зі	сі	ці
е	ле	ме	не	ве	бе	пе	зе	се	це
я	ля	мя	ня	вя	бя	пя	зя	ся	ця

Каго як завуць

— Чаму цябе Ветрыкам завуць? — спыталіся ў жарабяткі.

— Я хутка бягу, як вецер.

— А цябе Нясушкай за што?

— Я яйкі нясу.


— А цябе Крыкуном? — спыталіся ў пеўня.

— Я моцна крычу.

— А цябе Упартым?

— Не скажу! — адказаў ослік. І стукнуў капытом па зямлі.

С. Станюк



Ці такія звяры ў нашых казках?

Баязлівы, як леў.
Дужы, як заяц.
Хітры, як .
Упарты, як ліса.

малоць	смак	каштаваў
змалоць	смачна	пакаштаваў

Воўк-гультай

Пакаштаваў аднаго разу воўк хлеба. Смачна. І пытаецца:

— Скажы мне, чалавеча, як яго робяць?

— Трэба глебу ўзараць. Пасля пабаранаваць.

— І тады есці?

— Не. Трэба пасеяць, зжаць, памалаціць, змалоць... Потым спячы. А тады ўжо есці.

— Што смачна, то смачна, — сказаў воўк. — Але ж колькі працы! Жыў я без хлеба дагэтуль і далей буду жыць.

Так і жыве воўк без хлеба.





ці	це	ця
дзі	дзе	дзя
зі	зе	зя

Дз дз

Дз дз





цень	вер
дзень	звер
тыдзень	дзверы

Іна	мець	дзед	дзевяць
Дзіна	медзь	дзядзя	дзесяць
Зіна	мядзведзь	дзядзька	дзякуй

Імяніннікі гука «дз»

Надзя

Дзіма

Федзя

Дзяніс



Вадзім

Уладзя

Валодзя

Прыказка

Няма смачнейшай вадзіцы,
як з роднай крыніцы.

Дзе яны выраслі?

У агародзе? У садзе?
У вадзе? На полі?

Прыказка. Хто не сее, у таго не расце.

Успомні казку



Дзе посуд жорава,
а дзе — лісічкі?



дзік	ход	раз	змена
маладзік	сход	штораз	зменлівы

Зменлівы месяц

Надзя стаіць пры акне. Глядзіць на месяц.

Дзіва дый годзе. Нядаўна месяц быў, як ражок. «Маладзік», — казала тады мама.

Рос, рос, і цяпер, як залаты шар. Гэта поўнік, або поўня.

Што з гэтым месяцам? Адзін і той жа, а штораз іншы.

Розны месяц



маладзік падпоўнік поўнік сход, або ве́тах

дзень	мерка	раве	стаў
адзенне	прымерка	кравец	астаўся

раз	біў	рана
праз	згубіў	ранне
якраз	разгубіўся	убранне

Чаму месяц без вопраткі ходзіць?

(Казка)

Захацеў неяк месяц пашыць сабе ўбранне. Пайшоў да краўца. Зняў кравец з яго мерку.

— Прыходзь, — кажа, — праз тыдзень.

Мінуў тыдзень. Прымярае месяц адзенне. Ды дзе там яно яму! Вузкае,



цеснае. «Відаць, памыліўся», — падумаў кравец. І зноў кажа месяцу:

— Прыходзь праз тыдзень.

Пашыў кравец. Сядзіць, чакае. Аж тут коціцца па небе месяц. Круглы, вялікі. Тут і без прымеркі відаць! Вопратка будзе малая.

Разгубіўся кравец і кажа:

— Не магу табе, месяц, убранне пашыць. То ты, як сярпок. То ў палавіне. А цяпер у поўні. Ніколі не будзе табе ўбранне якраз.

Так і астаўся месяц без вопраткі.



Словы-браты:


адзенне, вопратка, убранне.

Жартоўная лічылка

Слухайце ўсе мяне.
Я раскажу, хто дзе жыве.

Верабей — у норцы,
конь — у каморцы.
Рыбка — у лесе,
мышка — на стрэсе.
Індык — у вадзе.

А ты жывеш дзе?



Заяц і капусны лісток

Бяжыць з агарода заяц. Бяжыць, уцякае ў поле, у лес. За ім Лыска. Вось-вось нагоніць, разарве.

За што так гоніць Лыска зайца?

За такі маленькі ліст капусты?

Бедная зайцава доля.

М. Фальскі



Стаялі словы з апошнім складам -**ка**. Прыйшлі да іх кароткія словы **на**, **у**, **аб**. І перарабілі -**ка** ў -**цы**.

шап**ка**	на	шап**цы**
галоў**ка**		галоў**цы**
май**ка**		май**цы**
фуфай**ка**	у	фуфай**цы**
бул**ка**		бул**цы**
талер**ка**	аб	талер**цы**
міс**ка**		міс**цы**

Ёё

Ёё

Загадка

Рыба і шчотка —
дзіўная радня:
розныя іголкі,
адно імя.


Гэта ёрш.


І гэта ёрш.



Нашы птушкі

У нашым краі — Беларусі —
ёсць буслы, сарокі, гусі.
І вядуцца на балотах
жураўлі ў густых чаротах.

Пачнуць хорам —
не здзівіцца!
Ёсць дзе пець і весяліцца!

Алесь Гурло

Языкаломка

Чыё-чыё? Ні маё, ні тваё — нічыё.

воз	нос	пілот	лён	Сеня	салёны
вёз	нёс	палёт	клён	Соня	зялёны
лог	цок	восы	лозы	сёння	вясёлы
лёг	цёк	вёслы	слёзы		

Чмелікі

◠е	◠ё
ле	лё
не	нё
се	сё
зе	зё
це	цё
ве	вё
ме	мё
пе	пё

Ішоў Лёня ўлетку полем. Быў цёплы дзень. Мінуў лён, жыта.

Раптам чуе звон. Чмелік! Хутчэй за ім. А чмелік шусь у мох і знік. Уцёк.

Разгарнуў Лёня мох. Так і ёсць. Чмелікі. Тут іх соты. Тут мёд.

Знайшоў Лёня саломку. Пасмактаў трошкі, а больш не чапаў. Рэшта хай чмелікам.



о	но	ло	во	бо	по	со	зо	цо	фо
ё	нё	лё	вё	бё	пё	сё	зё	цё	фё

Сцяжынка



Штодзень уранку летам,
ледзь-ледзь пачне світаць,
бяжыць сцяжынка з дому
па лесе пагуляць.

Яна заўсёды знае,
дзе ягады растуць,
дзе перайсці канаву,
балотца абагнуць.

А толькі звечарэе
і стане цёмна зноў,
у лесе не заблудзіць
і прыбяжыць дамоў.

Г. Кляўко

цёплы — халодны
лёгкі — …
далёкі — …
вясёлы — …
(блізкі, сумны, цяжкі)

Восы і слёзы



Што бывае пасля вос?..
Толькі шчылінкі для слёз.



Юю

Юю



Кожным ранкам
чыста мыю
рукі, вушы,
твар і шыю.

Пасля заняткаў дома я чытаю, рашаю, рысую.

Крыўда алоўка

Я заўсёды вам служу:
і рашаю, і пішу,
усё, што хочаш,
я змайструю,
на паперы нарысую.

Дык чаму, скажыце мне,
хваляць вас, а не мяне?

Што ўмее аловак



лук	Люда	цюбік	цюль
люк	Люба	дзюба	цюльпан
лік	люблю	зязюля	цюлька
			Цюлік

◠ё	◠ю
лё	лю
нё	ню
цё	цю
зё	зю
мё	мю
вё	вю
пё	пю
бё	бю

Пяро і аловак

Нюра просіць дзядулю:

— Скажыце, дзедку, чаму гэта пяро завецца пяром?

— А таму, што даўней людзі пісалі гусіным пяром. Адсюль і яго назва, хоць цяпер яно сталёвае.

Нашы продкі пісалі яшчэ і алавянаю палачкаю.

Здагадайся, адкуль пайшла назва аловак.





е	ле	не	це	зе	се	пе	бе
ё	лё	нё	цё	зё	сё	пё	бё
ю	лю	ню	цю	зю	сю	пю	бю

На рэчцы зімою

Не сядзіцца ў хаце
хлопчыку малому,
кліча яго рэчка,
цягнуць санкі з дому…

— Мамачка-галубка! —
просіць ён так міла, —
можа б ты на рэчку
пагуляць пусціла?

Я не буду доўга,
зараз жа вярнуся,
трошачкі на рэчцы
ў санках паважуся.

Якуб Колас



Ветлівасць

Калі я знаёмых
ці родных
спаткаю,
вітаюся,
зняўшы ўбор
з галавы,
і ветла кажу,
калі што ў іх
спытаю:
— Вялікі вам дзякуй!
Прабачце.
А вы?



Ласкавыя словы

Мама, мамка, мамачка, матулечка, матуля, матулька.

Тата, татка, татачка, татуля, татулька, татулечка.

Баба, бабуля, бабулька, бабулечка, бабка.

Дзед, дзядуля, дзядулька, дзядок, дзядулечка, дзедка.

страх страшны	спаць паспаткі	гумно прыгуменне





Курапатка

Снег вакол. А ў курапаткі —
ані норкі, ані хаткі.
— Што ж паесці? Дзе паспаткі?
Мерзнуць лапкі ў курапаткі.

За кустамі вельмі блізка
ходзяць страшны воўк і ліска.
Зерне б выдзеўбла з былінкі,
ды каршун глядзіць з асінкі.

З клёну вырвала б пупышку —
совы тояцца ў зацішку.
Шусь пад снег яна крадком —
спіць з галодным жыватком.

Раніцой на прыгуменні
ты сыпні ёй крошак жменю.

Данута Бічэль

Паўлюк і Цюлік

Даў дзед Даніла Паўлюку шчаня.

Цяпер Паўлюк і Цюлік — неразлучныя сябры. Куды Паўлюк, туды і Цюлік. Ад Паўлюка ні на крок.

Ідзе Паўлюк у школу, і Цюлік бяжыць за ім. Ці вецер дзьме, ці мяце завея.

Паўлюк сядзіць у класе на ўроку. А Цюлік чакае яго на двары.

Чаму ж сёння Цюліка няма каля школы?

А сёння ж нядзеля.



Словы-браты:

бяжыць, імчыцца, нясецца;
сябар, дружбак, таварыш.



* * *

Ладу, ладу, ладкі.
— Дзе былі?
— У бабкі.
— Што пілі вы?
— Ма-ла-ко.
— А што елі?
— Ко-ко-ко!

Мы і заўтра пойдзем
да бабулі нашай.
Абяцала бабка
бярозавай кашы.

Васіль Вітка

Коцік-варкоцік

Коцік-варкоцік
лёг на жывоцік.
Лапкі пад вушка —
не трэба падушка.

Н. Галіноўская



У кошкі кіпці ў аксаміце. Сцеражыся, мышка!

Языкаломкі

Паклаў Коля кола каля калодзежа.
Зоя з лазою хадзіла за казою.
Добры бабёр да бабранят.

Дж дж



Дж дж

хачу	саджай	вадзі	джала
хаджу	ураджай	ваджу	дождж
сачу	джэм	глядзі	дожджык
саджу	джэмпер	гляджу	

Дожджык

Ліся, дожджык,
градкі мый!
Ну яшчэ хоць трошкі!
Дожджык, дожджык
залаты,
вадзяныя ножкі!



Народныя прыкметы

Кветкі моцна пахнуць перад дажджом.
Ластаўка лятае нізка — на дождж.

Коцікі

Села кошка на парожку,
вяжа коціку панчошку.
А пасля пашые тапкі,
каб кату не мерзлі лапкі.

Данута Бічэль





Галубы

Елі з рук яны каноплі,
крыллем лопалі, гулі
і дажджу буйныя кроплі,
быццам зернеты, дзяўблі.

Максім Лужанін

Вожык



— Вожык, ты чаму калючы?
Гэтак колешся балюча?
— Бо ваўкі, лісы, мядзведзі —
не найлепшыя суседзі!

Б. Захадэр

Поні

Хто, сябры, не бачыў поні?
Поні —
гэта тыя ж коні!



Тая ж грыва,
той жа хвост,
толькі вось маленькі рост...

Зебра



Вось дык конік —
дзіўны нейкі,
быццам сшытак
у лінейку!

Для чаго ты —
для чытання
ці для чыстага пісання?

Л. Рашкоўскі

Жарт



А лісіца задаецца:
яе імем грыб завецца!

А. Каско

п’ю	еў	ехаў	двор
б’ю	з’еў	пад’ехаў	надвор’е



Як хто спіць



Кот-варкот пад’есць, пап’е малака. Падбярэ пад сябе лапкі. Заплюшчыць вочы — і мур-мур.

Сабака скруціцца ў клубочак і засне. Здаецца, моцна спіць, а чуе, калі хто чужы ў двор ступіць.





Многія птушкі спяць на дрэвах. І ніякае надвор’е ім не страшна. У іх цёплае пер’е.

Качкі, гусі могуць спаць на вадзе. А чайкі, калі спяшаюцца ў вырай, спяць нават у палёце.



Сом



Спіць спакойна сыты сом.
Спіць і сніць салодкі сон.

ключ	едзь	пісала
	прыедзь	дапісала
уключыла	прыедзьце	падпісала

Любіна пісьмо

Люба ўключыла камп’ютар.

Яна друкуе пісьмо бабулі.

«Любая бабка! Мы ўсе вельмі любім Вас. Калі ласка, прыедзьце на мой дзень нараджэння. І вазьміце з сабою Віцю і Васю. У мяне ёсць новы дыск пра Кузю».

І падпісала: «Ваша ўнучка Люба».

А пасля дапісала: «А цукерак не трэба».

А сама думае: «Прывязе, прывязе бабка цукерак».



Гэта ліст.



І гэта ліст.

Прынясіце ліст паперы,
што шырэй за нашы дзверы,
што вышэй за нашу шафу,
нарысую вам жырафу.

Васіль Вітка

Словы-браты: пісьмо, ліст.

Алфавіт

Аа а	Бб бэ	Вв вэ	Гг гэ	Дд дэ	
Ее е	Ёё ё	Жж жэ	Зз зэ	Іі і	
Йй (і нескладовае)	Кк ка	Лл эл	Мм эм	Нн эн	
Оо о	Пп пэ	Рр эр	Сс эс	Тт тэ	
Уу у	ў (у нескладовае)	Фф эф	Хх ха	Цц цэ	Чч чэ
Шш ша	ы ы	ь мяккі знак	Ээ э	Юю ю	Яя я

Беларусь — твая Радзіма

Ты тут нарадзіўся. Тут нарадзіліся твае бацькі — тата і мама. І бацькі тваіх бацькоў. Таму і называем мы Беларусь сваёю Бацькаўшчынаю.

Ёсць на свеце краіны, меншыя за Беларусь. Ёсць большыя. Але Радзіму любім мы не за тое, што яна вялікая ці багатая. А за тое, што яна наша.



Так нараджалася Беларусь



Полацк — самы стары, славуты горад на Беларусі. Яму больш за тысячу гадоў.





Нава́градак — першая сталіца магутнай старажытнай дзяржавы.

А якія за́мкі будавалі нашы пра́дзеды! Вось замак у Міры.

Нашы асветнікі



ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ
перапісвала кнігі.
Яна вучыла
грамаце.



КІРЫЛА ТУРАЎСКІ
напісаў шмат кніг.
Ён вучыў нас быць
добрымі.

Князь
УСЯСЛАЎ
ЧАРАДЗЕЙ

Разумны і адважны воін.
Пры ім на рэках
Нямізе і Свіслачы
быў закладзены
горад Мінск.



А вось што мы ўбачылі ў музеі



Гэта гаршкі-спарышы. У час касьбы і жніва ў іх неслі на поле абед. Адразу тры стравы. Нават ёсць сальніца.

Хлеб ды соль! Смачна есці!

Шырокія і доўгія слуцкія паясы. Іх ткалі з шаўковых, залатых і сярэбраных нітак. У дні радасці насілі іх светлым бокам. А ў дні смутку — цёмным.



Мінск

Мінск — самы вялікі горад Беларусі. Гэта наша сталіца.

Тут шмат заводаў і фабрык.

У Мінску многа школ.

У Мінску выдаецца шмат газет і часопісаў. У Мінску надрукаваны ваш «Буквар».

Вуліцы Мінска шырокія. На іх шмат машын.

А пад зямлёй працуе хуткая чыгунка — метро. Прыгожае і зручнае.



Нацыянальная бібліятэка Беларусі

Твая мова

Кожны народ любіць сваю мову.

Кожны немец умее гаварыць па-нямецку, француз — па-французску, рускі — па-руску, паляк — па-польску.



Дык давай гаварыць па-беларуску! Дзе б ты ні быў: дома ці ў школе, у вёсцы ці горадзе. Вучы гаварыць свайго брацiка і сястрычку на роднай мове.

Гавары па-беларуску ветліва. Каб і іншым, хто цябе пачуе, хацелася гаварыць па-беларуску.

Хлопчык і лётчык




— Мой мілы таварыш, мой лётчык,
вазьмі ты з сабою мяне!
Я — ведай — вялікі ўжо хлопчык
і ўмею ўжо лётаць у сне.

Мне ўжо надакучыла дома —
у дзіцячы хадзі адно сад,
а так паглядзеў бы, вядома,
на іншы парадак і лад.

Вазьмі ж мяне, лётчык, хачу я
пабыць у людзях, паглядзець,
як месяц на небе начуе,
як блукае ў лесе мядзведзь,

як свецяцца ночкаю зоры,
а днём не відаць іх чаму,
як рэчкі ў далёкія моры
ўлетку плывуць і ўзіму.

Янка Купала




Янка Купала

Вы ўжо чыталі верш «Хлопчык і лётчык». Яго вельмі любіў першы ў свеце касманаўт Юрый Гагарын. Гэты верш напісаў Янка Купала. У яго ёсць і шмат іншых цудоўных твораў.

Паэт нарадзіўся якраз на Купалле. Даўней лічылі, што на гэтае свята расцвітае папараць. Хто знойдзе яе кветку — знойдзе шчасце.

А шчасце для Янкі Купалы — свабодная Беларусь.





Якуб Колас

Якуб Колас, як і Янка Купала, — вялікі беларускі паэт.

Ён напісаў шмат кніг для дарослых і дзяцей.

Ён вучыў любіць родную зямлю, народ, беларускую мову.

У Мінску ёсць цудоўныя помнікі Янку Купалу і Якубу Коласу.



Каток

У Савосева суседа
быў пярэсценькі каток,
выхаванец Паўла-дзеда,
такі слаўны пестунок!

Нос чарнявы,
хвост бялявы,
задзірасценькі;
кіпцік-шчыпчык
заграбасценькі;

вусы русы
патырчастыя;
тая спінка,
як націнка,
выгінастая.

Вушкі-слушкі
не мыляюцца,
вочкі ўночку
запаляюцца.

Хадзіў коцік пад масток,
лавіў рыбку за хвасток,
потым дзеду ён на печы
казкі-байкі варкаваў,
белым хвосцікам дарэчы
тахты спевам адбіваў.

Якуб Колас



Калі мы так гаворым?



Просім! Дзякуй!
Хлеб-соль!
Смачна есці!
Смачна снедаць!

Смачна абедаць!
Смачна вячэраць!
Бывайце здаровы!





Добры дзень!
Добры вечар!
«Дабранач!» — кажу ўсім нанач.

Прыказка

Любіць увесь свет лагодны прывет.



Гэта коцікі.



І гэта коцікі.

Коцікі



За вёскай, ля балоцінкі,
у вербавым галлі
маленечкія коцікі
зімою спаць ляглі.

Прыйшла ж вясна —
усё чысценька
паскідвалі з сябе
і жоўтыя, пушыстыя,
паселі на вярбе.

Кастусь Цвірка

Верабейчык



Верабейчык: ціў, ціў, ціў,
колас дзюбкаю ўхапіў,
а таму што ён быў добры —
па зярнятку ўсім дзяліў.

Елі зерні ўсе са смакам,
шчабяталі: дзякуй, дзякуй.

Матуліны рукі



Матуліны рукі
нас песцяць, галубяць.
Так шчыра, як маці,
ніхто нас не любіць.

Матуліны рукі —
адзіныя ў свеце.
Шануйце, любіце
заўсёды іх, дзеці.

Вера Вярба

Дзесяць памагатых

У Ніны ў хаце заўсёды чыста. Яна і ўрокі зробіць, і малога брацíка пазабаўляе. І маме на кухні паможа.

На ўсё ў яе часу стае́.

— Як ты паспяваеш усё рабіць? — пытаецца ў яе сяброўка Воля.

— А ў мяне дзесяць памагатых. Яны мне і робяць усё.

— Дзе ж гэтыя твае памагатыя?

— Ды вось яны, — усміхнулася Ніна. І паказала на свае дзесяць пальцаў.

Спрэчка

Жылі на адным двары кот, певень і сабака.

— Няма нічога лепш за малачко, — кажа кот Максім. — Добра таксама і мышкаю паласавацца. Але злавіць яе — вялікі клопат.

— Што малачко! Вось каб авёс ці крупы. Гэта куды лепш, — кажа певень.

— Ды што вы, браткі, кажаце, — перапыніў іх Лыска. — Няма нічога лепшага за костачку. Колькі я на сваім вяку з'еў касцей! Я дык ужо разбіраюся ў ядзе!..

Спрачаліся яны, спрачаліся, а што лепш, і цяпер да згоды не прыйшлі.



Воўк



Хвошча, хвошча дождж.
Воўк схаваўся ў хвошч.
Хвост пад хвашчом,
а воўк пад дажджом.

Васіль Вітка

Вуж

Вуж
паўзе
сабе
дарожкай,
не кране
ніводнай
ножкай.
Ён
пакратаў бы,
каб мог,
але
вуж
не мае
ног.

Максім Лужанін

Языкаломка

У бары грыбы бяры.

Добры зайцаў звычай

Увесну ў зайчыхі вывеліся першыя зайчаняты. Вунь яны — белыя клубочкі — сядзяць пад кустом. Здалёку нібы гурбачкі снегу. Затаіліся зайчаняткі. І дрыжаць — ад холаду і голаду. Хіба мала ворагаў у зайцоў?

Дзе цяпер іх мама?

Адзін паратунак малых — добры зайцаў звычай. Якая б зайчыха ні бегла тут, спыніцца. І напоіць іх цёплым тлустым малачком.

Бо, можа, і яе дзетак цяпер корміць іншая зайчыха-маці.

* * *

Па-над белым пухам вішняў,
быццам сіні аганёк,
б’ецца, уецца шпаркі, лёгкі
сінякрылы матылёк.

Максім Багдановіч



Жук і слімак

Пагожым летнім ранкам
на лузе за сялом
сустрэўся жук аднойчы
з рагатым слімаком.

— Здарова! — жук вітае. —
Куды, браток, ідзеш
і з ракавіны хатку
нашто з сабой нясеш?

Абцёр слімак пот з твару,
гаворыць так жуку:
— Нямала перажыць мне
прыйшлося на вяку.

То сцюжа, то марозы,
то навальніца, дождж.
То часам у дарозе
захопіць змрок і ноч, —

шукай тады начлегу
пад нейкім там кустом...
Гавораць яны гэтак
і раптам чуюць — гром.

Ударыў дождж краплісты.
І жук пабег шукаць
дзе ў засені цяністай
шырокага лістка.





Але на цэлым лузе
няма страхі нідзе,
і мокры, ледзь жывы ён
да слімака ідзе.

— Пусці, браток, пагрэцца,
змок дужа на лугу,
насіць за гэта хатку
табе дапамагу.

У ракавіне шчыльнай
вандроўнікі сядзяць.
І нават дождж краплісты
не зможа іх дастаць.

Але мінулі хмары,
і сонца ўстала зноў,
жук хатку слімакову
пакінуў і пайшоў.

Забыўся пра нягоды
і не наўме жуку,
што абяцаў паднесці
ён хату слімаку.

Максім Танк

Загадкі

Хто паўзе вось тут у парку,
а свой дом нясе на карку?

Хто ў чырвоных ботах ходзіць па балотах?

Нашы святы



Аднаго разу разгаварыліся дзеці пра святы.

— Я люблю **Дзяды**, — кажа Соня. — Гэта свята ў памяць нашых дзядоў-прадзедаў. Іх даўно ўжо няма. А ўсё, што вакол, зроблена іх рукамі. На Дзяды ў кожным доме вараць розныя стравы. Не меней як дванаццаць. І абавязкова ячную кашу. Гэта наш самы даўні хлеб.

Наша Ніна паціху сказала мне:

— Ты адразу не наядайся. Бо чым далей, тым смачнейшыя стравы будуць.

І праўда. Апошнімі былі разынкі і мёд.

— А я люблю, — кажа Сцёпа, — **Калядкі** — вясёлыя святкі. Зіма. Вечар. Мама раскладае духмянае сена на стале. Засцілае яго белым абрусам. Ставіць на стол розныя прысмакі.

А як цікава гуляць на арэхі ў цот ці лішку!

Па вёсцы ад хаты да хаты ходзяць з казою калядоўшчыкі.

І наша Віка вывернула кажух, зрабіла з саломы рогі, скакала і спявала:

— Го-го-го, каза! Го-го-го, шэрая!




— А мне лю́бы **Вялікдзень**, — кажа Сяргей. — Мама пячэ смачны пірог. Мы фарбуем яйкі. Мой брат Янка добра ўмее на зуб выбіраць мацакі́. І гуляе ў бі́ткі. Аднаго разу выбіў аж сем яек.

А Яна ўмее прыгожа маляваць. Вось яе пі́санкі.

— А я з усіх свят найлепш люблю **Дзень незалежнасці**, — сказаў Паўлюк. — У гэты дзень мы расказвалі вершы пра Беларусь, спявалі песні, танцавалі, а таксама правялі конкурс малюнкаў. Я атрымаў першую прэмію.





— Мне вельмі падабаецца, — кажа Міхась, — **Купалле**. Хлопцы і дзяўчаты паляць агонь, спяваюць песні, водзяць карагод. Дзяўчаты пускаюць вянкі па рацэ. Я бачыў, як з вады выскачыў вадзянік. Якраз як Ваня Куліцкі... Потым скакалі праз агонь. Але я не скакаў. Бо трошкі збаяўся.

Як прыйшла да нас кніга

Буквар на гліняных таблічках

Ты, можа, думаеш, што кнігі былі заўсёды. А між тым быў час, калі ні кніг, ні паперы не было.

На чым толькі не пісалі тады людзі! На лістах дрэў, на бярозавай кары, на гліняных таблічках.

Але ўяві свой «Буквар» з такіх гліняных таблічак. Які цяжкі ён быў бы! Ты б яго не падняў. Ды і конь не пацягнуў бы воз з такім букварам.

Толькі дзесяць легкавых машын змаглі б павезці тваю кнігу. Вось і ўяві: ідзеш ты ў школу, а дзесяць машын вязуць за табою твой «Буквар».

Смешна! Нязручная такая кніга.



Кнігі на ланцугу

Пазней пачалі пісаць на скурах цялят, ягнят, казлянят. Ачышчалі скуры ад поўсці і пісалі.

На тоўстую кнігу ішло шмат скурак. Падумаць толькі — цэлы статак на адну кнігу.

Таму даўней кніга была вельмі дарагая. Нават не ўсякі багаты чалавек мог купіць яе.

Ды і перапісвалі кнігі ад рукі. Не кожную і за год перапішаш.

Не дзіва, што тады кнігі ў бібліятэках былі акаваныя. І нават навязаныя на ланцугу.

Іх можна было там пачытаць на стале. Але няможна было ўзяць дадому.

Наш першадрукар

Першым чалавекам, які пачаў друкаваць кнігі на нашых землях, быў беларус Францішак Скарына.

Ён нарадзіўся ў горадзе Полацку. Гэта было даўно — больш за пяцьсот гадоў таму. Але і цяпер памятаюць пра яго. Яго імем названы вуліцы, плошчы.

А вось які цудоўны помнік паставілі яму ў яго родным Полацку.



Свята

— Сёння ў нас свята, — сказала настаўніца.

— Якое ж свята, — падумала Вераніка, — сёння будны дзень.

— Калі свята, дык чаму ж мы вучымся? — спытала Алеся.

— Дзеці, вось мы і прачыталі буквар. Ён навучыў нас чытаць і пісаць. Вы ўжо можаце самі пісаць пісьмы, чытаць часопіс «Вясёлка», газету «Раніца». У вас цяпер стане шмат-шмат сяброў. Бо кнігі — самыя лепшыя сябры. Усе кнігі вы ўжо можаце прачытаць. Яны раскажуць вам шмат цікавых казак, вершаў.

Дык хіба гэта не свята?!



Прыказка

Кніга — маленькае акенца, ды праз яго ўвесь свет відаць.





Чыталачка

Як радасна ўмець чытаць!
Не трэба маму турбаваць,
не трэба ўпрошваць і сястрычку:

«Ну, прачытай яшчэ хоць крышку!»
Не трэба клікаць і чакаць,
а можна ўзяць і пачытаць.

В. Берастаў



Загадкі



З вострым носам
чорны Міша.
Сам непісьменны,
а ўсё жыццё піша.

* * *



На ўсіх мовах
пісаць можа.
Ад цябе залежыць,
ці досыць прыгожа.

Вучэбнае выданне

КЛЫШКА Анатоль Канстанцінавіч

БУКВАР

Падручнік для 1 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

7-е выданне, перагледжанае

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна*. Рэдактар *А. М. Парахневіч*. Мастацкія рэдактары *А. М. Хількевіч, Л. У. Паўленка, Л. І. Мялоў*. Тэхнічны рэдактар *М. І. Чаплаводская*. Камп'ютарная вёрстка і графіка *А. Ю. Гурчонак*. Карэктары *Т. М. Вядзернікава, Д. Р. Лосік, В. С. Бабеня, Г. В. Алешка*.

Падпісана ў друк 10.11.2010. Фармат 70x100$^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура журнальная рубленая. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 12,35+0,33 форз. Ул.-выд. арк. 12,1+0,3 форз. Тыраж 19 300 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП № 02330/0494156 ад 03.04.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.